# ТАКІХ МУЗЕЯЎ НАМ НЕ ХАПАЕ

## Яблыня для Максіма

У пачатку 1990-х у Малой Багацькаўцы на месцы былой хаты Гарэцкіх, якая згарэла, была адбудавана новая — пад музей. Летась узнікла пытанне аб пераносе музея ў Мсціслаў. Нагадаем, ідэю гэту прапанавала адна з мінчанак, якая палічыла, што да вясковага музея складаней дабірацца, чым да гарадскога. Бо ад Мсціслава да малой радзімы Гарэцкага прыкладна 26 кіламетраў. Каб разабрацца ў праблеме, «Звязда» ў снежні мінулага года звярталася да гэтай тэмы. Музей пакінулі там, дзе ён і быў. Як растлумачылі ў аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мсціслаўскага райвыканкама, аўдыторыя падзялілася на дзве часткі. Адны выказаліся за перанос, другія супраць. Прычым спрачаліся ў асноўным мінчане. Пераканаўчым стаў аргумент, што каштоўнасць музея ў Малой Багацькаўцы, акрамя таго, што там пануе тая аўра, у якой рос будучы беларускі класік, яшчэ і ў тым, што там пахаваны яго бацькі і сваякі.

Выбар зроблены, але пытанні засталіся. Музей наведваюць у асноўным школьнікі Мсціслаўскага раёна, якіх спецыяльна прывозяць на аўтобусе. Іншых экскурсій наогул няма. Зрэдку заязджаюць аматары, якім цікава асоба Максіма Гарэцкага. Па словах **дырэктара Мсціслаўскага раённага гісторыка-археалагічнага музея Людмілы КІРЫЕНКІ**, за паўгода там пабывалі толькі бацька з сынам са Слуцка. Дарэчы, яны прывезлі з сабой саджанец яблыні і з дазволу абслугоўвага персаналу музея пасадзілі непадалёк ад хаты пісьменніка.



**Дацэнт кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Міхась Кенька падкрэсліў важнасць ушанавання памяці.**

## «Мсціслаўскі вулкан талентаў не заглух...»

...пісаў Уладзімір Караткевіч у кнізе «Мсціслаў. Эсэ пра гісторыю і людзей адной зямлі», маючы на ўвазе Максіма Гарэцкага. Вось некалькі цытат з яго твора. *«Для мсціслаўцаў Максім Гарэцкі дарагі яшчэ і за тое, што ў творах ягоных гамоніць, радуецца, працуе, плача і смяецца, гаворыць адметнай і трапнай гаворкай уся Мсціслаўшчына...»*

Пісьменнік таксама згадвае не менш таленавітага брата Максіма Гарэцкага — Гаўрылу, «аднаго з выдатных геолагаў Саюза, акадэміка, заснавальніка нашай палеапатамалогіі, навукі аб рэках даўно мінулых часоў». Уладзімір Караткевіч хацеў, каб у Малой Багацькаўцы стварылі сядзібу братоў Гарэцкіх і ўключылі яе ў турыстычны маршрут «Залатое кальцо Магілёўшчыны».

Музей паявіўся, але такога маршруту пакуль няма. А без гэтага музей дрэнна працуе. Пра яго ведаюць у асноўным толькі жыхары раёна. А пра тое, што ў Горках быў дом, дзе жыў Максім Гарэцкі, большасць даведалася толькі пасля таго, як яго знеслі. І тое, дзякуючы, гнеўным публікацыям у СМІ. Летась, пасля таго як у «Звяздзе» быў надрукаваны артыкул пра магчымы пераезд музея з Малой Багацькаўкі, пляменнік пісьменніка Радзім Гарэцкі вельмі балюча ўспрыняў навіну. Ён накіраваў у рэдакцыю падрабязную справаздачу, як стваравўся музей і ўшаноўвалася памяць пісьменніка. Ён з крыўдай успамінаў пра знесены дом у Горках і памятны знак, які абяцалі зрабіць, але так і не ўсталявалі.

## Што трэба для памяці?

Гісторыкі, літаратуразнаўцы, музейныя супрацоўнікі сабраліся ў музеі гісторыі Магілёва за круглым сталом, каб абмеркаваць пытанні музеефікацыі літаратурных мясцін. Удзел у размове прынялі супрацоўнікі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, прадстаўнікі грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх», Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Беларускага фонду культуры, прадстаўнікі мясцовай улады, абласнога краязнаўчага музея імя Раманава, Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Перад пасяджэннем яны наведалі музей Максіма Гарэцкага ў Малой Багацькаўцы і засталіся вельмі задаволены, што музей пакінулі на месцы. Бо, на думку спецыялістаў, было б цяжка потым тлумачыць турыстам пра тое асяроддзе, у якім выхоўваўся будучы пісьменнік. Адзінае, што трэба змяніць, гэта адносіны да музея.

— Трэба болей рэкламаваць гэта месца, рабіць усё, каб пра яго ведалі ў вобласці, краіне, — лічыць **дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Дзмітрый ЯЦКЕВІЧ**. — Квэсты, педагагічныя заняткі, лекцыі, фэсты — трэба шукаць розныя формы. А яшчэ распрацоўваць турыстычныя маршруты, каб забяспечыць прыток людзей.

Вядомая рэч, што аднымі сіламі Мсціслаўскага гісторыка-археалагічнага музея, на балансе якога знаходзіцца дом у Малой Багацькаўцы, турыстаў не прывабіш. У гэтым павінны быць зацікаўлены і мясцовыя ўлады, прычым зноў-такі не толькі Мсціслава. Вёска знаходзіцца якраз на паўдарозе паміж Мсціславам і Горкамі. Трэба, каб і другі бок прыклаў намаганні.

## Музеяў шмат не бывае

Ёсць прыклады ў краіне, калі музеі працуюць у асноўным толькі на адных імёнах. Той жа аднойлены музей Рэпіна ў Здраўнёве на Віцебшчыне, Васіля Быкава ў Бычках і нават палац Радзівілаў у Нясвіжы.

— У нас не хапае музеяў, прысвечаных таму ці іншаму знакамітаму беларускаму роду, на прыкладах якіх можна было б выхоўваць людзей, — адзначыў **старшыня грамадскай арганізацыі «Беларускі фонд культуры» Уладзімір ГІЛЕП.** — У маштабах вёскі, раёна абавязкова павінен быць музей якога-небудзь роду, годнага ўшанавання. У сучаснай моладзі адсутнічае пачуццё гонару за сям'ю, род.

Дарэчы, Магілёўшчына вельмі багатая на знакамітыя прозвішчы: Аркадзь Куляшоў, Алесь Адамовіч, Аляксей Пысін, Алесь Пісьмянкоў... І для іх папулярызацыі недастаткова куточкаў у школе або стэнда ў краязнаўчым музеі.

## Вандроўка па мясцінах Гарэцкага

Наступны год юбілейны для Максіма Гарэцкага, спаўняецца 125 гадоў са дня яго нараджэння. І, каб гэта імя гучала як мага мацней, удзельнікі круглага стала прапанавалі наступны год назваць Годам Максіма Гарэцкага. Размова таксама ішла пра тое, што ў найбліжэйшы час трэба пачаць падрыхтоўку матэрыялаў для выдання творчай спадчыны Максіма Гарэцкага ў выглядзе збору твораў, а таксама аднатомнага энцыклапедычнага даведніка «Максім Гарэцкі».

Па ацэнцы спецыялістаў, стан дома ў Малой Багацькаўцы добры. Трэба толькі правесці добраўпарадкаванне тэрыторыі і мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменніка. Неабходна таксама арганізаваць вандроўкі па мясцінах, звязаных з імем Максіма Гарэцкага, з абавязковым наведваннем Літаратурнага музея ў Малой Багацькаўцы. А ва ўстановах культуры і адукацыі арганізаваць мерапрыемствы, прысвечаныя юбілейнай даце. У планах таксама правесці ўрачыстыя мерапрыемствы з удзелам дыпламатычных прадстаўніцтваў РБ і беларускіх суполак у краінах, дзе пражывау Максім Гарэцкі — Расіі, Літве, Латвіі, Польшчы і іншых.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
zigulya@zviazda.by

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «ДЗЕ ХАЧУ, ТАМ І ПЛАВАЮ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

— Ратавальнікам на вадзе шмат галаўнога болю дастаўляюць п'яныя кампаніі, — кажа Дзяніс Чашун. — На процілеглым баку Камсамольскага возера з боку праспекта Пераможцаў адкрылася шмат бараў. Хітрая кампанія разбіваецца на дзве часткі. Першая ідзе да нас, каб узяць напракат катамаран. Паколькі людзі цвярозыя, алкаголю пры сабе не маюць, то мы ім катамаран выдаём. А пасля яны падбіраюць таварыша з «гаручым» дзе-небудзь у зацішным месцы. І аднойчы мы такую п'яную кампанію заселі на катамаране падчас абходу акваторыі. Яны зналі выратавальныя камізэлькі і правалі. Убачылі, што мы выязджаем з-за павароту, і далі драла. Адзін адпачывальнік падае за борт. Мы — да небаракі, а катамаран — хутчэй ад нас. Чалавека дасталі, прывезлі на выратавальную станцыю. У крыві было тры праміле алкаголю. А сябры прыехалі толькі праз тры гадзіны. І спыталі адразу ж: «А дзе наш таварыш?» Я ў адказ: «А чаму вы ўцякалі?» — «Мы спалохаліся». Я кажу: «А вы разумееце, што ён мог патануць і яму маглі б не дапамагчы?» «Разумеем, але спалохаліся». Так што не ўсе тыя сябры, хто называе сябе так...

У летні перыяд у чалавека, які тоне, ёсць у запасе толькі пяць хвілін. Пасля гэтага наступае кіслароднае галаданне і мозг памірае. І нават калі небараку ўдасца выратаваць ад смерці, то дэ-факта гэта будзе жывы труп.

— Паспець уратаваць чалавека не так і лёгка. Стандартная сітуацыя: прыязджаем на выклік. Пытаемся: дзе патануў ваш таварыш? Адзін паўп'яны паказвае ў адзін бок, другі — у процілеглы. Бачнасць у мутнай вадзе складае 5—20 сантыметраў. Каб увявіць сабе працу вадалаза, зайдзіце ў падвал, выключыце святло і паспрабуйце навобмацак выцягнуць прадмет, які знаходзіцца невядома дзе. Лёгка?

У сярэднім за дзень водныя ратавальнікі выязджаюць на баявы выклік 2—3 разы. Праўда, сярод іх шмат ілжывых. Большасць з іх разгортваецца па адным і тым жа сцэнарыі. Сядзела на беразе кампанія, адпачывала са спіртным. Адзін чалавек вырашае сысці ў цень і прылегчы адпачыць. Там ён засынае. Рэчы застаюцца на месцы. Кампанія бачыць: вопратка ёсць, чалавека няма. Значыць, патануў. Набіраюць нумар 101. Мы прыязджаем, пачынаем шукаць тапельца. Праз дзве гадзіны выходзіць паўп'яны чалавек з кустоў і пытаецца: «А каго тут шукаюць?» — «Дык цябе і шукаюць!» — «А я тут заснуў... метраў за пяцьсот...»

— А часам нам паведамляюць падлеткі, што тоне іх таварыш, — расказвае Дзяніс Чашун. — Прылятаем, бачым: стаяць па калена ў вадзе, крычаць, што тонуць, і самі рагочуць. А дзесяці ў гэты час можа адбывацца сапраўдная бяда.

Асноўная маса тых, каго ратуем, — адны і тыя ж людзі. Летась мы даставілі на выратавальную станцыю навучэнца аднаго са сталічных каледжаў шэсць разоў. А бывае і так, што выцягнулі п'янага, аддалі таварышам і кажам, каб не пускалі яго ў ваду. Ад'язджаем, абарочваемся — а ён зноў ляцць у Свіслач.

Таксама ўскладняюць дзяжурства адпачывальнікі на матрацах. На кожнай такой прыладзе напісана, што яна не з'яўляецца плавальным сродкам. Парушальнікі ж пачынаюць прыдумляць самыя неверагодныя версіі. Маўляў, заляжаўся, не заўважыў, як за буй занесла. Ці знесла хваляй з берага. Асабліва весела гэта чуць у бязветраны дзень. Калі я працаваў на Мінскім моры, то аднойчы сутыкнуўся з выпадкам, як два чалавекі на матрацы спрабавалі праплыць... сем з паловай кіламетраў. Больш за тое, матрац быў гружаны сумкамі са спіртным. Аказалася, што на выспе адпачывала кампанія, а іх забылі...

**«У летні перыяд у чалавека, які тоне, ёсць у запасе толькі пяць хвілін. Пасля гэтага наступае кіслароднае галаданне і мозг памірае. І нават калі небараку ўдасца выратаваць ад смерці, то дэ-факта гэта будзе жывы труп».**

У забароненых месцах пры купанні можа падсцерагаць і схаваная небяспека. Вадалазы знаходзілі на дне возера ванны, кухонныя пліты, смеццевыя кантэйнеры і нават светлавыя мачты. Запчасткі ад аўтамабіляў і бляшанкі з-пад кансерваў — гэта ўжо стандартны набор. І вось у месцы, дзе купанне не дазволена, з'явіўся адпачывальнік, умоўны Вася. Ён лезе на бетонны пірс і скача ў ваду. У выніку ратавальнікі дастаюць гэтага Васю з ужо зламаным хрыбетнікам. А ўсё з-за таго, што мінулай ноччу ўмоўны Пеця вырашыў парысавацца перад дзяўчынай і скінуў у ваду бетонную сметніцу.

## «Тут вада цяплейшая!» — «А там — бясплатная!»

Акваторыя Камсамольскага возера спецыфічная. Бераг Свіслачы ў гэтым месцы даволі крывы, ды і велізарны востраў замінае паўнавартаснаму агляду непасрэдна са станцыі. І менавіта таму для школьнікаў, якія ўтульна размясціліся каля самых соплаў непрацуючага фантана, наша з'яўленне стала зусім нечаканым.



Фота Надзеі БУЖАН.

— Гм, калі гэты фантан уключыцца раптам, то ім жа галовы адсячэ напорам вады, — прамармытаў адзін з матросаў.

— Гэй, вы што тут робіце? А дзе дарослыя?

— Ды мы тут з Дома грэблі, практыкуемся.

— Без суправаджэння?

— А нам дазволілі.

— Хто менавіта дазволіў? Зараз спытаем у трэнера.

Дарога да трэнера доўгая, займае некалькі кіламетраў. І яна пралягае праз месцы, якія вельмі палюбіліся нядобрасумленным купальшчыкам. Першага з іх мы засякаем літаральна праз паўхвіліны. Мужчына гадоў 50 купаўся даволі далёка ад буйкоў.

— Так, што вы тут робіце? Кіруйцеся на пляж.

— А тут вада цяплейшая, — спрабуе жартаваць парушальнік.

— Затое там — бясплатная. Колькі складае штраф, ведаеце?

Купальшчык нешта прабурчаў і павярнуў да буйкоў.

Заўважыўшы лодку ратавальнікаў, з пірса на процілеглым баку вокамгненна з вопраткай у руках збягаюць двое падлеткаў, з якіх вада льецца цуркам. А мы праязджаем мост цераз вельмі ажыўленую вуліцу Арлоўскую.

— З яго вельмі любяць скакаць экстрэмалы. Роўна па цэнтры тут глыбіня — два з паловай метры. А крыху ўлева ці ўправа — метр сорак. І калі неабачлівы плывец патрапіць на гэта месца — ён амаль стапрацэнтны інвалід... Тут Дзяніс Чашун рэзка паварочвае лодку ўправа. А там — карціна, як кажуць, алеем. Дзве жанчыны загараюць на беразе ракі. Дзіця адной з іх ходзіць па парапеце. Маці гэта не бачыць, бо яна ляжыць галавой у процілеглы бок.

— Гэй, маці, забярыце сына з парапета! — крычаць з лодкі.

— А што тут можа здарыцца? — перапытвае жанчына.

— Ды тут вельмі глыбока, доўга даставаць будзем, калі зваліцца.

— Калі чалавек тоне, ён зусім не крычыць, — кажа **ратавальнік-вадалаз Мікалай КАСЦЮКЕВІЧ.** — Вада запаўняе лёгкія імгненна. Таму не верце ў гэтай частцы кінафільмам...

Жанчына тут жа кліча малога да сябе. А мы неўзабаве пад'язджаем да Дома грэблі. Пасля непрацяглай размовы з супрацоўнікамі Таварыства ратавання на водах трэнер дастае мабільны тэлефон і прыкладвае яго да вуха. На зваротный дарозе мы спецыяльна заязджаем да непрацуючага фантана, дзе і злавілі першых парушальнікаў. Адметна — там ужо нікога няма...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
schklennik@zviazda.by